УДК [947.6:338.439] «193»

**А.А. Субоцін,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава*

# ХАРЧОВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СТАХАНАЎЦАЎ БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1930-х гг.

Праблема сацыялістычнага спаборніцтва, у тым ліку стаханаўскага руху як адной з яго форм, падрабязна была адлюстравана ў працах беларускіх і расійскіх гісторыкаў. У іх асвятляліся пытанні арганізацыі працоўнай дзейнасці, уплыву руху на павышэнне прадукцыйнасці працы, паскарэнне тэмпаў вытворчасці, засяроджвалася ўвага на дзейнасці партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных органаў у разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва ў гады другой пяцігодкі [1]. У замежнай гістарыяграфіі стаханаўскі рух разглядаўся пераважна

ў кантэксце аналізу палітычнай сістэмы СССР, характару ўзаемаадносін грамадства і ўлады [2]. Пры гэтым гісторыкі не закраналі тэму штодзённасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху, якая ўключае ў сябе вывучэнне спецыфікі харчавання гэтай катэгорыі працоўных.

Мэта нашага артыкула – вызначэнне асаблівасцей харчовага забеспячэння стаханаўцаў БССР у другой палове 1930-х гг.

У развіцці стаханаўскага руху партыйнае кіраўніцтва бачыла не толькі аснову для павышэння прадукцыйнасці працы і інтэнсіфікацыі індустрыяльнага будаўніцтва, але і для стварэння заможнага жыцця, паляпшэння дабрабыту рабочых і калгаснікаў. І. Сталін на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў адзначаў: «На самом деле социализм может победить только на базе высокой производительности труда, более высокой, чем при капитализме, на базе изобилия продуктов и всякого рода предметов потребления, на базе зажиточной и культурной жизни всех членов общества» [3, с. 364]. Вышэйадзначанае дазваляе нам сцвярджаць, што з сярэдзіны 1930-х гг. у дзяржаўнай прапагандзе назіраецца адмаўленне ад ідэі «рэвалюцыйнага аскетызму» ў быце і пераход да канцэпцыі пабудовы грамадства, дзе кожны яго член зможа стаць заможным чалавекам у выніку актывізацыі сваёй працоўнай дзейнасці. Засяродзім сваю ўвагу на асаблівасцях харчавання стаханаўцаў як аднаго з бакоў штодзённасці, у якой пачало праяўляцца заможнае жыццё.

За кошт павышэння заработнай платы ў выніку значнага перавыканання норм стаханаўцы маглі дазволіць сабе больш якаснае харчаванне, чым астатнія рабочыя. Стаханавец Віцебскага лесазавода імя «Праўды» Капышка, заробак якога павысіўся ад ранейшых 7–8 рублёў у дзень да 25 30 рублёў, гаварыў пра сваё харчаванне: «Ни одного дня не проходит у меня без мясного обеда» [4, л. 47]. Жанчыны-стаханаўкі, на якіх быў ускладзены асноўны клопат па вядзенні хатняй гаспадаркі, адзначалі паляпшэнне харчавання сваіх дзяцей. Стаханаўка Дземідзенка (Віцебскі шчоткамбінат) з зробленых 406 рублёў за лістапад 1935 г. патраціла на прадукты 269 рублёў. Яна адзначала: «Я начала хорошо питаться и обращаю особое внимание на питание ребёнка, чтобы он вырос и воспитывался в лучших условиях, чем я» [4, л. 47]. Падобныя ж меркаванні выказвала наконт харчавання сваёй дачкі стаханаўка С. Ждановіч з Каўгарскага спіртзавода: «Конфеты, печенье, молоко, масло и другие продукты всегда она имеет в обильном количестве» [5, с. 43]. Паляпшэнне харчавання стаханаўцаў прывяло да разумення імі таго, што грашовыя сродкі, атрыманыя за ўдасканаленне вытворчасці, маглі стаць рэальнай асновай пераўтварэння штодзённага жыцця ў заможнае. Жанчыны-стаханаўкі, пачалі ўспрымаць сваю працу і яе матэрыяльныя вынікі як значны ўнёсак у забеспячэнне харчавання сваёй сям'і. Адсюль і статус жанчыны ў хатняй гаспадарцы змяніўся. Яна аказалася на роўных пазіцыях з мужчынам пры фарміраванні сямейнага бюджэту. Прыклады харчавання герояў вытворчасці сталі стымулам далейшага разгортвання стаханаўскага руху. Меркавалася, што рабочыя, перайшоўшы на стаханаўскія метады працы, будуць атрымліваць адпаведныя высокія заробкі, за кошт якіх змогуць павысіць ўзровень свайго харчавання.

Якаснае харчаванне стаханаўцаў як вынік павышэння заработнай платы адлюстравалася ў правядзенні імі святочных вячэр сумесна з мясцовым кіраўніцтвам. Такія святочныя мерапрыемствы, з аднаго боку, паказвалі рэальнае паляпшэнне харчовага забеспячэння перадавікоў вытворчасці, з іншага – мелі дэманстратыўны характар як прыклад таго, што кожная сям'я, члены якой сумленна працуюць і паказваюць выдатныя вынікі працы, можа дастойна сустрэць свята без цяжкасцей у забяспечаннасці прадуктамі харчавання. З нагоды 18-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі на кватэры лепшай стаханаўкі фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» Доры Папковіч была праведзена такая вячэра. На ёй прысутнічалі астатнія стаханаўцы прадпрыемства і сакратар віцебскага гаркама КП(б) Б Жураўлёў. Як адзначаў карэспандэнт газеты «Звязда», меню на вячэры было выключна разнастайнае, найлепшыя стравы змянялі адна адну, на стале быў вялікі выбар разнастайных напояў: каньяк, партвейн і інш. [6, с. 3]. Святочныя вячэры закладвалі асновы заможнасці ў штодзённае жыццё стаханаўцаў і адначасова замацоўвалі традыцыю святочных застолляў у сацыяльнай практыцы працоўных.

Для стаханаўцаў, занятых у сельскай гаспадарцы, паляпшэнне харчовага забеспячэння было асноўным, калі не адзіным, стымулам удасканалення працоўнай дзейнасці, таму што аплата працы ў гэтай сферы вытворчасці ажыццяўлялася галоўным чынам не грашыма, а якраз прадуктамі харчавання за выкананыя працадні. Адпаведна стаханаўцы, што выпрацоўвалі большую колькасць працадзён, атрымлівалі і большую колькасць прадуктаў. Харчовае забеспячэнне ў сельскай гаспадарцы адыгрывала і ролю своеасаблівай прэміі. У Лепельскай акрузе стаханаўцы атрымлівалі ў калгасах у 1935 г. па 60 – 75 пудоў хлеба авансам [7, л. 260]. У тым жа годзе стаханавец А. Авяр'янцаў з Буда-Кашалёўскай МТС атрымаў за перавыкананыя працадні 55 пудоў збожжа і 62 пуды бульбы [8, л. 38, 38 адв.], брыгадзір стаханаўскай брыгады А. Сафронаў з вёскі Кузьневічы (Гомельскі раён) – 72 пуды збожжа і 144 пуды бульбы [8, л. 77, 77 адв.].

Стаханаўцы ж прамысловасці акрамя павышэння заработнай платы, за кошт якой маглі палепшыць сваё харчаванне, атрымлівалі і шэраг паслуг у харчовым забеспячэнні. Была ўстаноўлена практыка дастаўкі прадуктаў харчавання стаханаўцам на дом. Аб такой паслузе для сваіх 25 стаханаўцаў з гандлёвымі прадпрыемствамі ў 1936 г., напрыклад, дамовілася віцебская фабрыка «Прафінтэрн» [9, л. 5]. Надавалася вялікая ўвага якаснаму харчаванню стаханаўцаў як асноўнаму фактару далейшага ўдасканалення вытворчасці. У ходзе стаханаўскіх сутак 8 студзеня 1936 г. на Магілёўскім гарбарным заводзе імя Сталіна спецыяльна для стаханаўцаў у абедзенны перапынак было ўзмоцнена харчаванне ў сталоўцы [10, л. 5]. Такое харчаванне атрымлівалі і стаханаўцы Бабіцкага механізаванага ўчастка падчас свайго адпачынку ў прафілакторыі [11, с. 4].

У сферы харчовага забеспячэння стаханаўцы займалі прывілеяванае становішча, што выявілася ў стварэнні на прадпрыемствах сістэмы так званых стаханаўскіх абедаў. Такія абеды адпускаліся ў сталоўках па зніжаных цэнах. На Бабруйскім лесакамбінаце для 60 стаханаўцаў абеды адпускаліся па цане 1 р. 50 к., у той час як для астатніх рабочых – па 2 р. 50 к. [12, л. 2], на прадпрыемствах г. Барысава стаханаўцы атрымлівалі скідкі на абеды (50 %) [12, л. 97], на Мінскім дрэваапрацоўчым заводзе імя Р. Люксембург стаханаўскія абеды былі танней за звычайныя на 40 к. [12, л. 99], на гарбарным заводзе «Бальшавік» абед для стаханаўцаў з 3–4 страў каштаваў ад 1 р. да 1 р. 10 к. [13, с. 3], а на некаторых мінскіх прадпрыемствах для ўсіх стаханаўцаў абеды ўвогуле былі бясплатнымі [12, л. 98]. Для наладжвання лепшага харчавання адміністрацыя прадпрыемстваў часта вылучала для стаханаўцаў грашовыя даплаты на набыццё абедаў. Такія датацыі, напрыклад, атрымлівалі ўсе стаханаўцы Віцебскага лесазавода №13 [12, л. 115]. Арганізацыя стаханаўскіх абедаў з’яўлялася лагічным працягам сістэмы абедаў для ўдарнікаў гадоў першай пяцігодкі, калі існавала нарміраванае размеркаванне прадуктаў, пры якой ударнікі пераўтварыліся ў прывілеяваную катэгорыю рабочых на аснове таго, што ім выдавалася павышаная норма прадуктаў харчавання ў сталоўках [14, с. 92]. Стаханаўскія абеды існавалі ўжо ва ўмовах адмены карткавай сістэмы і адсутнасці нарміраванага забеспячэння, якое проста замянілася зніжэннем цэн на абеды для перадавікоў-стаханаўцаў.

Сістэма стаханаўскіх абедаў пераняла ўсе характэрныя рысы ўдарных абедаў. Так, прадугледжвалася вылучэнне ў сталоўках для перадавікоў-стаханаўцаў спецыяльных сталоў. Гэтыя сталы лепш абслугоўваліся і адпаведна мелі дабраякасны рацыён. Стаханаўцы мелі магчымасць рабіць папярэднія заказы на абеды, што і пастаўляліся на гэтыя сталы (такая сістэма заказаў існавала, напрыклад, па г. Віцебску на фабрыцы гнутай мэблі, фабрыцы імя Лекерта, шчоткамбінаце, фабрыцы імя К. Цэткін) [4, л. 48]. У некаторых выпадках спецыяльна для стаханаўцаў вылучаліся асобныя памяшканні пад сталовыя. Так было зроблена ў кастрычніку 1936 г. на кандытарскай фабрыцы «Камунарка» і Мінскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча [15, с. 3]. Стварэнне асобных сталоў для стаханаўцаў паўплывала на зацвярджэнне іх сацыяльнага статусу як прывілеяванай групы рабочых. Унутры аднаго працоўнага калектыву ў быце вылучалася асобная сацыяльная прастора. Наяўнасць стаханаўскіх сталовак ці спецыяльных сталоў, за якімі маглі сядзець толькі стаханаўцы, і рацыён якіх адрозніваўся як па цане, так і па якасці ад рацыёну сталоў звычайных рабочых, падкрэслівала элітны статус удзельнікаў стаханаўскага руху.

Арганізацыя сістэмы стаханаўскіх абедаў у працэсе далейшага разгортвання стаханаўскага руху і павелічэння колькасці стаханаўцаў паступова пачала сутыкацца з праблемай фінансавай і матэрыяльнай падтрымкі гэтай прывілеі для перадавікоў вытворчасці. Кіраўніцтва шэрага прадпрыемстваў было не ў стане забяспечыць усіх стаханаўцаў таннымі і дабраякаснымі абедамі. На практыцы не ўсе рабочыя, што станавіліся стаханаўцамі, атрымлівалі стаханаўскія абеды, а толькі тыя, якія выпрацоўвалі самыя высокія нормы ці першымі ўключыліся ў стаханаўскі рух. На віцебскім заводзе «Чырвоны металіст», напрыклад, пры наяўнасці 180-ці стаханаўцаў таннымі стаханаўскімі абедамі па 50 капеек забяспечвалася толькі 60 чалавек. Астатнія стаханаўцы былі незадаволеныя такім становішчам і задалі пытанне адміністрацыі: «Чым мы стаханаўцы горшыя чым тыя?» [12, л. 115]. Такім чынам, унутры групы стаханаўцаў склалася іерархія ў харчовым забеспячэнні, у межах якой частка перадавікоў не карысталася ў поўнай ступені тымі прывілеямі, якія прадстаўляліся дзяржавай.

Такія супярэчнасці ў сістэме харчовага забеспячэння ўяўлялі сабой пэўную перашкоду ў разгортванні стаханаўскага руху. Магчыма па гэтай прычыне ў ЦК КП(б)Б пачалі выказвацца прапановы аб скасаванні стаханаўскіх абедаў. У прыватнасці, загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б Л. Готфрыд заяўляў: «На некоторых предприятиях имеет место, как мне кажется, извращение следующего порядка: в столовых созданы специальные стахановские столы с дотацией от администрации каждому стахановцу в отдельности. В некоторых местах эти стахановские столы, в виду ограниченности дотаций, превращаются в тормоз для роста стахановского движения потому, что количество

стахановцев ограничивается количеством стахановских обедов. Везде, где мы обнаружили такого рода факты, предложили ликвидировать немедленно это дело [16, л. 37]. Пры тым ён адзначыў, што кожны стаханавец за сваю павышаную заработную плату можа набыць дабраякасны абед без дапамогі адміністрацыі прадпрыемства [16, л. 37]. Такую пазіцыю можна ахарактарызаваць як спробу адмаўлення ад захаваўшыхся рыс сістэмы нарміраванага забеспячэння, чым, як мы адзначалі вышэй, і з'яўляліся стаханаўскія абеды, і перайсці да сістэмы спажывання прадуктаў, пры якой дабрабыт будзе вызначацца не толькі статусам, але і ўзроўнем заработнай платы.

Тым не менш нельга казаць, што ўсе стаханаўцы цалкам за кошт сваёй заработнай платы маглі дастаткова забяспечыць сябе і сваю сям'ю харчаваннем, пра што сведчыць наяўнасць у стаханаўцаў падсобных гаспадарак у выглядзе невялікіх участкаў зямлі, якія вылучаліся ім прафсаюзнымі арганізацыямі. Так, прафсаюзы ў Мазыры для стаханаўцаў вылучалі па 0,12 га агародаў [12, л. 52], на Аршанскім лесазаводзе для стаханаўцаў прадпрыемства пад індывідуальныя агароды выдалі 6 га зямлі [12, л. 29]. Часта ў дадатак да агародаў рабочыя-стаханаўцы трымалі свойскую жывёлу. На гэта паказваюць апытанні, зробленыя ЦК КП(б)Б наконт таго, што было куплена за першую палову снежаня 1935 г. удзельнікамі стаханаўскага руху. Стаханавец Гураў з Гомельскага шклозавода сярод такіх важных пакупак як пінжак і дамскія туфлі, адзначыў набыццё парася [16, л. 48], стаханавец Алёшын (г. Орша) галоўным расходам свайго сямейнага бюджэта лічыў пакупку кабана [16, л. 48]. А для стаханаўцаў Гомельскага торфзавода «Бальшавік» з прыгараднай гаспадаркі было раздадзена ў лістападзе 1935 г. 35 парасят [17, л. 86 адв.].

Як мы заўважылі, заможнасць штодзённага жыцця адлюстроўвалася ў харчовым забеспячэнні не ў поўнай ступені. Стаханаўцы не заўжды адчувалі сваю перавагу над астатнімі членамі працоўнага калектыву пры атрыманні прадуктаў, а такія мерапрыемствы як, напрыклад, стаханаўскія абеды, не ўспрымаліся імі як прывілеі. Пры абследаванні прафсаюзнай арганізацыяй матэрыяльна-бытавога становішча стаханаўцаў на Мінскім дрэваапрацоўчым заводзе імя Р. Люксембург ім задалі пытанне: «Ці адчуваецца розніца паміж абслугоўваннем стаханаўцаў і нестаханаўцаў?». На што быў дадзены адзін з адказаў: «Пакуль розніцы ніякай няма, толькі абед на 40 капеек танней» [12, л. 99]. Рамшчык-стаханавец Садаўнічэнка з гэтага ж завода некалькі разоў звяртаўся ў завкам, каб яму не давалі скідкі на абед, а лепш бы на гэтыя грошы даставілі дровы [12, л. 99].

Нягледзячы на пэўныя недахопы ў харчовым забеспячэнні, дзяржава імкнулася падтрымліваць прывілеяванае становішча стаханаўцаў, што асабліва праяўлялася падчас свят. Так, у Бабруйску лепшым стаханаўцам лесакамбіната ў дні Кастрычніцкіх свят у 1935 г. было даслана 20 харчовых пайкоў, а на швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага 15 стаханаўцаў атрымалі харчовыя падарункі на суму 50 рублёў кожны [12, л. 2, 203]. На лесасплаўным участку Руба з нагоды тых жа Кастрычніцкіх свят спецыяльна для стаханаўцаў быў наладжаны банкет [18, л. 70]. У 1936 г. спецыяльныя падарункі для стаханаўцаў да свята Кастрычніцкай рэвалюцыі былі выпушчаны Беларускім трэстам «Галоўхлеб» [19, с. 4].

Такім чынам, вышэйшым партыйным кіраўніцтвам адным з аспектаў стаханаўскага руху было вылучана паляпшэнне сацыяльна-бытавых умоў працоўных, ставілася мэта зрабіць іх жыццё больш заможным на аснове ўдасканалення працы. Як паказвае харчовае забеспячэнне стаханаўцаў БССР у другой палове 1930-х гг., іх штодзённасць стала прыкладам такой заможнасці і росту матэрыяльнага дабрабыту працоўных, што праявіўся ў павелічэнні выдаткавання перадавікамі вытворчасці з сямейных бюджэтаў сродкаў на харчаванне. Адметнай рысай стаханаўскай штодзённасці былі прывілеі ў харчовым забеспячэнні. Яны знайшлі сваё адлюстраванне ў арганізацыі кіраўнікамі прадпрыемстваў сістэмы стаханаўскіх абедаў, выдачы грашовых датацый на харчаванне і спецыяльных харчовых пайкоў у святочныя дні, а для стаханаўцаў сельскай гаспадаркі харчовае забеспячэнне фактычна было адзінай прывілеяй у выглядзе выдачы прадуктаў за перавыкананыя працадні. Пералічаныя асаблівасці харчавання стаханаўцаў сталі сродкам зацвярджэння іх высокага сацыяльнага статусу. У той жа час якаснае харчовае забеспячэнне герояў вытворчасці выступала для астатніх працоўных як узор для пераймання у павышэнні ўзроўню свайго харчавання па выніках ўключэння ў стаханаўскі рух і ўдасканалення метадаў вытворчасці. Аднак заможнасць штодзённага жыцця стаханаўцаў была адноснай, таму што пры ўзрастанні колькасці стаханаўцаў прафсаюзы і адміністрацыя прадпрыемстваў па прычыне недахопу сродкаў не ў стане былі забяспечыць усіх іх харчаваннем на высокім узроўні, асабліва гэта датычылася арганізацыі стаханаўскіх абедаў.

*Літаратура і крыніцы*


1. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / рэд. кал.: І.М. Ігнаценка (стар.) [і інш.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972 – 1975. Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.) / І.Я. Марчанка [і інш.]. – 1973. 696 с.; История рабочего класса Белорусской ССР: в 4 т. / Ин-т истории АН БССР. – Мн.: Наука и техника, 1984–1987.

Т. 2: Рабочий класс БССР в годы Великой Октябрьской социалистической революции и построения социализма (1917 – 1937) / ред. кол.: М.П. Костюк (отв. ред.) [и др.]. – 1985. 488 с.; *Рогачевская, Л.С.* Социалистическое соревнование в СССР: Исторические очерки. 1917 – 1970 / Л. С. Рогачевская. – М.: Наука, 1977. – 352 с.; *Сахаров*, *В.А.* Зарождение и развитие стахановского движения (на материалах автотракторной промышленности) / В.А. Сахаров. – М.: Из-во МГУ, 1985. – 121 с.
2. *Siegelbaum*, *L.H.* Stakhanovism and the Politics of Productivity in the USSR. 1935 – 1941 / L. H. Siegelbaum. – Cambridge, 1988. 350 p.; *Filtzer, D.* Soviet Workers and Stalinist Industrialization: The Formation of Modern Soviet Production Relations / D. Filtzer. – N. Y., 1986. – 293 p.; *Maier, R.* Die Stachanov – Bewegung. 1935 – 1938. Der Stahanovismus als tragendes und verscharfenfends Moment der Stalinisierung der sowjetischen Gesellschaft / R. Maier. – Stuttgart, 1990. – 441 s.
3. Первое Всесоюзное совещание рабочих и работниц-стахановцев. 14–17 нояб. 1935 г.: стенограф. отчёт. М.: Партиздат ЦК ВКП (б), 1935. – 420 с.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 102. – Воп. 1. – Спр. 365.
5. Стахановцы спиртовой промышленности БССР / сост. И.М. Ярмошевич. – Мн.: Гос. изд-во Белоруссии, 1936. – 78 с.
6. *Зарубежны, А.* У гасцях у знатнай стаханаўкі / А. Зарубежны // Звязда. – 1935. – 14 лістап. – С. 3.
7. ДАВВ. – Фонд 10063. – Воп. 1. – Спр. 3.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. Воп.1. – Спр. 10790.
9. ДАВВ. – Фонд 1021. – Воп. 1. – Спр. 110.
10. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 10776.
11. Адпачынак стаханаўцаў лясной прамысловасці // Звязда. 1936. – 9 лют. – С. 4.
12. НАРБ. – Фонд 265. – Воп. 1. – Спр. 4238.
13. Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага Савета прафсаюзаў БССР і Наркоммясцпрома // Звязда. 1935. – 18 кастр. – С. 3.
14. *Лебина, Н.* XX век: словарь повседневности / Н. Лебина // Родина. – 2006. № 3. – С. 90 – 93.
15. Забота о стахановцах // Рабочий. – 1936. – 20 окт. – С. 3.
16. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп.1. – Спр. 9040.
17. НАРБ. – Фонд 277. – Воп. 1. – Спр. 444.
18. ДАВВ. – Фонд 102. – Воп. 1. – Спр. 377.
19. Падарункі для стаханаўцаў // Звязда. – 1936. 29 кастр. – С. 4.

*Summary*

*This article highlights a problem of the Stakhanov followers every day life of the BSSR in second half 1930-ies on an example of their food maintenance. The author analyzes privileges of Stakhanov followers in this sphere, opens the basic problems of their realization and mechanisms of perception by participants of the Stakhanov movement of the position in reception of a foodstuff.*